Download

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

Яшчэ два палітвязні паедуць у калонію

29 лістапада суд Маладзечна і Маладзечанскага раёна вынес прысуд палітвязням Аляксею Чашуну і Уладзіславу Тамашэвічу. Іх абвінавацілі ў абразе дзяржаўных сімвалаў (арт. 370 Крымінальнага кодэксу).

Юнакі былі затрыманыя 7 верасня гэтага года і да суда ўтрымліваліся ў следчай турме №8 у Жодзіна.

Справу разглядала суддзя Вольга Дубовік. Вядома, што Аляксея і Уладзіслава абвінавацілі ў тым, што яны **падпалілі дзяржаўны сцяг**, размешчаны каля адной з крам сяла Чырвонае Маладзечанскага раёна.

У выніку суддзя Дубовік прысудзіла абодвум па **аднаму году зняволення ў калоніі агульнага рэжыму.**

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.or
g/js/telegram-widget.js?
```

Copy